№ 6. Нанядзелак, 17 кастрычніка (4 акцябра) 1921 году. Год I.

БЕЛАРУСКІЯ ВЕДАМАСЬЦІ

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Вострабрамская 9 (Wilno, Ostrobramska 9), АДЧЫНЕНА што дня, апрача сьвят, ад 11 да 2 гадзіны.

Падпіска з паштовай перасылкай на 3 месцы 400 польскіх марак. За граніцай у два разы даражэй.

Цана абвестак: 75 польскіх мар. за радок самага дробнага шрыфту. Газэта выходзіць раз у тыдзень.

№ каштуець 30 польскіх марак

Сябры, не марудзьце з падмогаю „Беларускім Ведамасьцям“, калі ня хочаце, каб газэта зачынілася.

Арганізацыі і сьвядомыя беларусы, дэкляраваўшыя памагаць, успомніце аб сваіх словах.

ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Гэтымі днямі мае быць абвешчана пастанова Лігі Народаў у справе **Горнай Сьлезіі.**

Газэты паведамляюць, што прамысловы раён спрэчнай старонкі будзе падзелены між Нямеччынай і Польшчай.

Спадзяюцца непарадкаў з боку незадаволеных горна-сьлескіх немцаў, дзеля чаго акупацыйныя войскі Антанты ужо рыхтуюцца да магчымага баявога выступленьня.

Унутраныя справы **Нямеччыны,** пасьля такой-сякой згоды Баварыі з урадам усяе Нямецкае Рэспублікі, значна палепшалі, але непамысная для немцаў разьвязка горна-сьлескае спрэчкі можаць іх ізноў вельмі папсаваць. Немцы, аднак, яшчэ спадзяюцца на Англію, палітычныя і эканамічныя інтарэсы якой вымагаюць іншай пастановы ў справе Горнай Сьлезіі, чым тая, каторую цяпер Францыя праводзіць у Лізе Народаў.

Польшча і Савецкая Расея ў сваіх адносінах яшчэ ня маюць ладу, але астатнія дні перагавораў Карахана з Домбскім паказалі, што ў бліжэйшым часе, прынамся, да стану вайны, якога зусім можна было спадзявацца, ня дойдзе. Польшча, здаецца, высяліць Савінкава, Пятлюру і Балаховіча; а ці заплоцяць бальшавікі належнае Польшчы золата, газэты покуль што ня пішуць.

З другіх навін трэба адзначыць, што помач усяго сьвета **галадуючым расейцам** урэшце наладзілася; **ірляндцы** на дарозе паразуменьня з **Англіяй**: пасьля **турэцкіх** перамог **грэкі** патроху просяць замірэньня; **японцы** выходзяць з **Усходняй Сыбіры**; Антанта забараняе **сэрбам** нападаць на **Албанію**; пасьля зьезду **беларускіх** арганізацый у Празе застаўся Спаўняючы Камітэт для работы, паказанай у пастановах Зьезда.

Беларуска-польскія адносіны.

Беларускае пытаньне ў цяперашніх межах Польскай Рэспублікі набірае усё большай вагі. Прычыны гэтаму знаходзяцца як звонку, у зьвязку з сусьветнай палітыкай, так растуць кожны дзень і ўнутры.

Тымчасам, беларуска-польскія адносіны зайшлі у немагчыма глухі кут, з якога выхаду старым спосабам няма.

А выхад гэты патрэбен цяпер палітычным кіраўнікам Польшчы болей навет, чым самім беларусам.

Беларускае пытаньне, як і ўкраінскае, ужо зрабілася для Польшчы той балячкай на яе дзяржаўным целе, на якую так разьлічалі маскоўскія камуністы.

Цікаўна заўважыць тут, што рэакцыйныя польскія элементы, дзякуючы сваёй шовіністычнай сьлепаце зьяўляюцца сьмяхотнай цацкай у руках палітыкаў камуністычнай і манархічнай Маскоўшчыны.

Прадстаўнікі паступовага польскага грамадзянства, праўда ня ўсе, а маючыя найбольш шырокі сьветагляд і добра асьвядомленыя з Парыжа, даўно зразумелі небасьпеку, але покуль што ня могуць даць рады і не асабліва клапоцяцца аб тым, памылкова не прыдаючы покуль што справе грознага значэньня.

У руках тых большых цацак маленечкай забаўкаю выглядае самы правы і самы няважны беларускі «палітычны» гурток на чале з панам Аляксюком.

Пан Аляксюк, як палітычная асоба і як палітык, ёсьць поўнае нішто, нуль.

Гэта ёсьць пашыраны сучасны тып Рэпеціловa з Грыбаедаўскага «Горе от ума» („Шумім, братец, шумім!“), але з дамешкаю досыць энэргічнага фахоўца на ўсякія, блізка авантурныя штукі.

Няма нічога асабліва дзіўнога, што якраз на яго долю выпала работа аканчальна папсаваць беларуска-польскія адносіны і завесьці беларускае пытаньне ў Польшчы ў цёмны і няпрыгожы закутак.

З-за асобы п. Аляксюка усе паважныя і, трэба прызнацца, досыць моцныя сілы спаміж паланафільскаага беларускага грамадзянства аказаліcь выкінутымі з палітычнага ужытку.

Разумеецца, рэшта беларускага грамадзянства аб гэтым не шкадуе, бо тыя сілы робяць цяпер патрэбную культурна-грамадзкую работу замест сваей усьцяж няўдачнай палітыкі.

Але прыходзіцца проста чырванець ад нацыянальнага сораму за „работу“ п. Аляксюка і іжэ з ім.

А з ім ёсьць толькі адзін ідэйны грамадзкі працаўнік—гэта п. Пупка, паланафіл па ідэі. Няма сумніву, што ён неўзабаве адсунецца ад п. Аляксюка, хоць цяпер аб гэтым, пеўне, і ня думае. Другія аляксюкоўскія служкі—людзі або зусім нявідныя і выпадковыя, або, і найболей, людзі выбітыя з жыцьцёвай калюгі, якім усё роўна—як і дзе здавальняць патрэбы хворага арганізму.

Працаваць з Аляксюком няма каму сярод беларусаў. І дзеля таго работы ў яго фактычна ніякай няма і ня можа быць. Нікому няведамая, мізэрненькая газэтка „Jednaść“, мёртва-нараджоная і пустая арганізацыйка „Краёвая Сувязь“, не пасьмеўшая навет назвацца пабеларуску, якійсь далёкі ад усякай каапэрацыі—каапэратыўчык,—вось і ўсё! Ды й то на незацьверджанай за Польшчаю тэрыторыі.

Аляксюк-жа, патрапіўшы зьбіць з пункту усе паважныя беларускія паланафільскія сілы, зрабіўся запраўды, ў абстаноўцы цяперашніх беларуска-польскіх адносін, адзіным манапольшчыкам на усю беларускую работу пад Польшчаю.

Замест усей гэтай работы—нуль.

Ясна, што ў такім стане справа доўга стаяць ня можа. Ясна, што колькіміліённае беларускае насяленьне пад Польшчаю, ня можа істнаваць, як любіць пералічаць у сваіх артыкулах наш сябра, наймудрэйшы народнік Дзед Кузьма, ня можа істнаваць бяз сур'ёзнай і працаздольнай пры данных варунках нацыянальнай арганізацыі, бяз кнігі, бяз школы, без газэты, без эканамічных аб'яднаньняў і г. д.

Ня думаем мы тут падказываць такі ці гэткі выхад, як робіць Дзед Кузьма, бо ня верым асабіста ў магчымасьць знайці гэты выхад да той пары, покуль работадацелі пана Аляксюка не пераверацца, што яны залезьлі з сваім фахоўцам у цёмны і няпрыгожы кут, а балячка, тымчасам, расьце і расьце...

А. Мсьціслаўскі.

Што чуваць у сьвеце?

Японія ачышчае Усходнюю Сыбір.

Маскоўскія газэты паведамляюць з словаў японскага тэлегр. аг., што ў Токіо пастаноўлена эвакуаваць японскія войскі з Усходняе Сыбіры.

Ангельска-Ірляндзкае паразуменьне.

Ангельскі прэм'ер будзе старшынёю на першым пасяджэньні канфэрэнцыі з ірляндцамі. Формула дагавору аб прыняцьці дзяржаўнае еднасьці Англіі, з пагляду прэсы, значна зьмяніла думку сінфейнэраў на карысьць гэтага дагавору.

Паўстаньне ў Індыі.

Паўстаньне ў Індыі набрала партызанскага характару, брытанцы ня могуць ніяк усьмірыць яго.

Турэцка-грэцкая вайна.

На прапазыцыю ангельцаў пачаць перагаворы з грэкамі Кемаль-паша адказаў рашучай адмоваю.

Прадстаўніцтва Савецкай Украіны ў Польшчы.

8 кастрычніка прыбыло ў Варшаву дыплёматычнае прадстаўніцтва Савецкай Украіны.

Падзел Горнае Сьлезіі.

З Жэнэвы паведамляюць, што пытаньне аб падзеле прамысловага раёна Горнай Сьлезіі між Нямеччынай і Польшчай можна лічыць разьвязаным. (Е. Е.)

Падарожа нямецкіх работнікаў.

У Лёндан выехала дэлегацыя нямецкіх работнікаў у зьвязку з весткамі аб разьвязаньні горна-сьлескага пытаньня. (Pat).

Вірт пагражае адстаўкаю.

Нямецкі канцлер Вірт у разе непамыснага для Нямеччыны разьвязаньня горна-сьлескага пытаньня пойдзе ў адстаўку з усімі міністрамі. (Pat).

Зьезд расейскіх эсэраў.

У Празе зьбіраецца зьезд расейскіх социялістаў-рэвалюцыянэраў. Спаўняючы камітэт партыі хоча перанесьці сваю дзейнасьць бліжэй да граніц Расеі. (Pat).

Помач вучоным эмігрантам.

Урад Чэха-Славакіі асыгнуе 100 тысячаў крон па утрыманьне асоб, пакінутых пры расейскіх унівэрсытэтах рыхтавацца на прафэсароў. (Русрэс).

Высяленьне з Польшчы.

Польскія газэты паведамляюць, што па дамаганьню Савецкай Расеі Польшча мае высяліць за свае межы 14 асоб, якія вядуць барацьбу супроць бальшавікоў, у тым ліку Савінкавага, Пятлюру, Тутуніка і Булак-Балаховіча.

Туркі помшчаюцца грэкам.

Ангельскія газэты паведамляюць, што кемалісты (туркі, правадыром якіх Кемаль-паша) пакаралі сьмерцю 79 выдатных прадстаўнікоў грэцкага насяленьня, у тым ліку аднаго архірэя.

Махно.

Румыны згаджаюцца выдаць Савецкай Расеі Махно з варункам, што бальшавікі не пакараюць яго сьмерцю.

Пазычка для Польшчы.

„Пшэглёнд Вечорны“ паведамляе, што Польшча дастала ад Францыі пазычку ў 100 міліёнаў франкаў. Гэтым тлумачыць памененая газэта падвышку польскай маркі.

Апошняя навіна

„Gaz. Warcz.“ паведамляе, што пастанова Вышэйшай Рады аб Горнай Сьлезіі будзе афіцыяльна абвешчана варшаўскаму і берлінскаму Ураду 17 кастрычніка.

Савецкая Беларусь.

На ўзор „Северолесу“ рада народнай гаспадаркі Сав. Беларусі арганізуе „Западлес“ для эксплёатацыі беларускіх лясных багацьцяў пры дапамозе заграпічных капіталаў.

(„Бел. Звон“)

Літоўскае жыцьце.

Па загаду ўлады зачынена віленская літоўская газэта „Vilnius“.

Афіцыяльна паведамляецца: „З прычыны паданых у друк і распусканых чутак аб ні-бы та быўшых грубіянствах і скандалах з боку ўрадовых органаў пры выдаленьні з дзяржаўнага будынку на Лукішскім пляцу 1-га кастрычніка г. г. Літоўскай Гімназіі, Аддзел Друку і Веравызнаньня Час. Урад. Камісіі упаўнамочан паведаміць, што Дэпартамэнт Унутраных Спраў ніякіх афіцыяльных даных, пацьвярджаюць падобныя прыпадкі, ня маець.

Дзеля таго, аднак, што ў літоўскім друку паказаны некаторыя імены і прозьвішчы асоб, ні-бы-та, пацярпеўшых ад агентаў органаў басьпекі, Дырэктар Д-ту Ун. Спраў 11 кастрычніка зьвярнуўся да пракурорскай улады, каб зрабіць сьледзтва, рэзультаты якога будуць апублікованы, а вінаватыя ў дапушчэньні бязчынства, калі запраўднасьць яго знойдзе пацьверджаньне, будуць з усёю строгасьцю пацягнены да адміністратыўнага ці судовага адказу“.

Украінскае жыцьце.

Большасьць украінцаў у Львове не запоўніла аркушоў народнай перапісі, пішучы замест гэтага, што з прычыны прызнаньня Вярхоўнаю Радаю Усх. Галіцыі за край, акупаваны польскім войскам, украінцы не прызнаюць прынцыпіяльна перапісі, загаданай польскім урадам.

(„Белар. Звон“).

З Літэратурнай Хрыстаматыі.

Знаменіты сучасны беларускі паэт Янка Купала.

Янка Купала (Ян Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся 25 чэрвеня 1882 г. (ст. ст.) ў фальварку Вязынка, пад Радашковічамі, у Меншчыне. Паходзіць ён з беднай, працоўнай шляхты. Бацькі Янкі Купалы, ня маючы сваей зямлі, арандавалі невялічкія панскія двары, дзе ўраблялі зямлю ўласнымі рукамі. Да 19 гадоў жыцьця паэт, дастаўшы толькі пачатковую адукацыю ў вясковай школцы, жыў пры бацьках, як звычайны дзяцюк-земляроб, з мазалямі на руках ад усякай гаспадарскай работы. Але ён дужа любіў чытаць і шмат чытаў. Потым Янка Купала пайшоў у сьвет, у заробкі, пераспрабаваў розных прафэсій і ўрэшце прыбіўся работнікам ў адзін бровар. Яшчэ раней пісаў ён расейскія і польскія вершыкі, а 15 мая 1905 года надрукаваў у менскай расейскай газэце „Сѣверо-Западный Край“ свой першы беларускі верш „Мужык“, па зьместу чыста клясавы і яшчэ далёкі бд пазьнейшых ідэй паэта ў беларускім адраджэньні. Неўзабаве Янка Купала робіцца залатым супрацоўнікам усіх беларускіх выданьняў і здабывае сабе шырокую славу. З матарыяльнай дапамогай некаторых беларускіх дзеячаў ён здалеў праслухаць у 1909-1913 гадох агульнаасьветныя курсы Чарняева ў Пецярбурзе. У часе вайны быў слухачом унівэрсытэту Шаняўскага ў Маскве, але змабілізаваны паехаў на вайну. Посьле рэвалюцыі жыў нейкі час з сваей жонкай, беларускай грамадзкай дзеячкай і пясьняркай, у Смаленску, у надта цяжкіх варунках. Цяпер жывець у Менску, працуючы ў аднэй з камісій Камісарыяту Асьветы.




Янка Купала.

Янка Купала напісаў болей за ўсіх беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў і займае ў нашай паэзіі першае месца. Па характару сваей здольнасьці ён—пераважна лірык, але піша таксама вершаваныя апавяданьні, паэмы, драмы і публіцыстыку. Цяпер ён зрабіўся самым магутным ідэйным правадыром ўсебаковага адраджэньня беларускай сялянскай нацыі, прычым пытаньне нацыянальнае і социяльнае, на беларускім фоне, у яго заўсёды гарманічна зьліты.

З яго твораў найвялікшую славу маюць зборнікі вершаў „Жалейка“ (1908 г.), „Гусьляр“ (1910 г.) і „Шляхам Жыцьця“ (1913 г.); З паэм „Адвечная песьня“ (1910 г.) і „Сон на кургане“ (1913 г.); апроч таго, драма „Раскіданае Гняздо“ і інш. Як паведамляюць, неўзабаве маюць выйці некалькі томаў яго новых твораў, напісаных за час вайны і рэвалюцыі. У 1920 г, ў Маскве вышаў зборнік яго вершаў у перакладах на расейскую мову, зробленых паэтамі В. Брюсавым, А. Карынфскім, Белавусавым, Нячаевым і інш. Апроч таго, ёсьць пераклады з Янкі Купалы на польскай, нямецкай, чэскай, украінскай др. мовах.

У бліжэйшым часе „Беларускія Ведамасьці“ спадзяюцца дастаць некалькі новых вершаў нашага слаўнейшага песьняра.



Залаты век беларускага слова.

16-е сталецьце лічыцца залатым векам у гісторыі старадаўнае беларускае літэратуры. Тады наша мова чулася ня толькі ў сялянскіх хатах ці спаміж сьвядомай народнай інтэлігенцыі, як цяпер, але ўва ўсіх-чыста галінах і праявах літэратуры і жыцьця на Беларусі яна панавала, як нацыянальна-дзяржаўная і літэратурная. Законы, дыплёматычная перапіска, урадовае дзелаводзтва, перапіска духоўнага і сьвецкага грамадзянства, літэратурныя творы—усё было пабеларуску. У гэты час аднэй мовай з усім беларускім народам гаварылі ў сваіх хорамах каралі, магнаты, архірэі, вучоныя людзі. Мова беларуская шанавалася, як родная і багатая, гібкая, прыгожая, высока-разьвітая і культурная. Тады былі ўжо і цьвёрдыя, агульныя, абавязковыя для ўсіх правілы правапісі.

Тут мы зьмяшчаем подпісы беларускіх вяльмож, панскія фаміліі каторых, пазьней, у часе палітычнага заняпаду Беларусі, троху-патроху выракліся сваей нацыі і зрабіліся для нас чужымі: 1) вядомага канцлера Лявона Сапегі, 2) Валовіча, 3) Палубенскай і 4) Масальскай.

Старадаўны статут.

У цікавым аглядзе манускрыптаў і друкаваных помнікаў па ваяўніцтву ў Маскоўшчыне на 1725 г., аўтор яго апісвае, паміж іншым, і адзін з старадаўных беларускіх статутаў.

Гэты беларускі рукапіс, пісаны скарапісьсю на 90 аркушох, захаваўся у Пецярбурскай Публічнай Бібліатэцы і называецца „Аб прадугатаўленьні рэчаў к вайне патрэбных“. Па часу напісаньня яго трэба аднясьці к палове XVII веку.

У гэтым статуце гаспадарская і адміністрацыйная часткі зьмешаны з часьцю тактычнай.

Пачынаецца статут указаньнем асобаў, патрэбных дзеля войска, перш гаворыцца аб правадырох, а потым аб майстрох і рамесьніках, Далей зьме-

шчаны думкі аб войску наагул, узятыя з твораў Вэгэцыя, Тэртуліана і іншых; заімі выкладаецца прыгатаваньне пораху, ракетаў і іншых падобных рэчаў.

Пасля апісываецца страляньне з гарматаў і падкопы (мінная вайна). Затым невядомы аўтор статуту спыняецца на вытварэньні высадкаў (дэсантаў) і на супольных дзеяньнях войска і флёты і заканчавае свой твор указаньнямі па абароне гарадоў і крэпасьцяў.

У свой час статут гэты меў нямалую вартасьць, як сярод беларусаў—вайсковых Літвы і Кароны, таксама і ў Маскоўшчыне, тады надта беднай кнігамі наагул, а тым больш па ваяўніцтву.

А. Р.

Быт нашых прадзедаў.

Будоўлі.

Нашы прадзеды будавалі свае хаты каля вазёр і рэк. Сяліліся досыць значнымі групамі па некалькі сем'яў. Харошых хат ў той даўны час беларусы ня ўмелі будаваць. Адзін гісторык, што бачыў, у якіх хатах жылі нашыя прадзеды, называе гэныя хаты „беднымі хацінкамі“. Аднак, ня толькі беларусы жылі ў бедных хатах, але блізу што і ўсе іншыя народы таго часу. У беларускай хаце ня было вакон: сьвет праходзіў у хату цераз дзірку ў сьцяне або ў страсе. Пасярод хаты стаяла печка бяз коміна, а дым выходзіў цераз дзірку ў страсе. З іншых будынкаў нашыя прадзеды мелі сьвіран, гумно і хлеў для жывёлы. Тут стаяў і азярод.

Выгляд і адзежа.

Старавечныя беларусы былі народам рослым і крэпкім, з сьветларусымі валасамі, з сінімі вачыма, з шырокім лобам. Мужчыны насілі бараду, жанчыны — даўгія валасы, заплеценыя ў косы. Адзежу выраблялі з скур і шэрсьці дзікіх зьвяроў, а так сама авечае воўны і лёну. Умелі валіць сукно і ткаць палотны. Адзежа беларуса была белая

Чым займаліся нашы прадзеды?

З самых даўных часоў беларус быў земляробам. Зямлю ён любіў і працаваў над ёю з ахвотаю, але ў той старадаўны час працаваць над зямлёю было цяжэй: каб вырабіць поле, трэба было спачатку выкарчаваць і спаліць лес, узьняць цаліну і толькі тады сеяць. Сеялі тое, што і цяпер: жыта, авёс, ячмень, пшаніцу, грэчку, лён.

Беларусы разводзілі коні, рагатую жывёлу, авечкі, сьвіньні і свойскіх птушак. Паша для жывёлы была агульнай, тады як зямлю ўраблялі, падчас, кожны гаспадар па-асобку.

У той час было многа дзікіх зьвяроў, якія псавалі палі і паядалі гаспадарскую жывёлу. Гэта выклікала ў беларусаў патрэбу бараніць сябе ад убыткаў.

У барацьбе з дзікім зьверам беларус зрабіўся добрым паляўнічым. З кап'ём (дзідаю) і лукам ён сьмела йшоў на мядзьведзя, ваўка, дзіка, лася. Куніцу, ліса, бабра і птушак беларусы дабывалі болей капканамі і сілкамі.

У рэчках і вазёрах была рыба: шчупак, плотка, карась, сом, мянтуз і г. д. Беларусы лавілі іх сеткамі, брэднямі, білі восьцямі.

Нашы прадзеды былі добрымі зямцамі. Каля хаты, у полі або ў лесе на дрэве ставілі вульлі. З мёду ўмелі варыць моцны напітак — „мёд“. З воску з часам навучыліся рабіць сьвечкі.

Збожжа малолі ў жорнах, якія складаліся з двох круглых і гладкіх камянёў. Ніжэйшы камень ляжаў у скрыні на ножках; у верхнім пасярэдзіне была дзірка, куды сыпалі зерняты. Верхні камень круцілі, узяўшыся за ручку на ім. Гэта была цяжкая работа.

Пралі верацяном, бо прасьніцы яшчэ ня знали. Ткалі на кроснах. Плялі рукавіцы і панчохі. Плялі і вышывалі вельмі прыгожыя паясы і йстужкі. Усім гэтым заняты былі ўзімку дзяўчаты і замужкі, а мужчыны ўзімку рабілі шчыты, мячы, дзіды, стрэлы, патрэбныя дзеля вайны з суседзямі, у якіх аружжа было ня лепшае за беларускае.

Сям'я.

З маладых гадоў бацькі прывучалі дзяцей да працы, сьцюжы, сырасьці, ветру. Узімку, прыкладам, дзеці хадзілі неабутымі. Прывыкшы да ўсяго, дзеці выбрасталі крэпкімі і выцяглымі людзьмі. Цяжкая праца ў полі ці на сенажаці ім была ні па чом. Бацька вучыў сыноў страляць з лука і валадаць мячом. Матка вучыла дачок прасьці, ткаць, вышываць і г. д. Сям'я жыла дружна. Бацька быў галавою сям'і, матка—сэрцам яе. Загадаў бацькі слухала ўся сям'я, і непакорных дзяцей бацька мог выгнаць з дому вон. Нашыя прадзеды былі людзьмі гасьціннымі і з гасьцём абходзіліся як найлепей, стараючыся яго накарміць і напаіць. Лічылася звычайным узяць у суседа, калі ў самаго ня было чым пачаставаць гасьця. На сваёй зямлі беларус лічыў абавязкам бараніць чужога. Па прыродзе беларусы былі дабрадушнымі.

Курганы, гандаль і водныя дарогі.

Аб тым, як жылі нашы прадзеды, многа могуць сказаць курганы. Яны ў вялікім ліку раскіданы па ўсім прасторы Беларусі. Курганы насыпаліся над магілаю памершага багатага ці ведамага чалавека. Цяпер шмат курганоў ужо раскапана і ў іх знайдзена многа розных рэчаў, паложаных па старадаўнаму звычаю ў магілу нябожчыка, бо лічылі, што і на тым сьвеце памершы і есьць і п'е і займаецца тымі-ж справамі, што й пры жыцьці. Сярод рэчаў, якія знойдзены ў курганох, ёсьць: шалькі з каменьнем для вагі, гаршкі, місы, рознае аружжа, косьці жывёлы і рыб, тканіна, бронзавыя, срэбныя і залатыя пярсьцёнкі, падвескі, бранзалеты, дыядэмы і інш. рэчы, вельмі прыгожыя каралі. Часьць гэтых рэчаў была прывознай, а часьць—выраблялася на месьце нашымі прадзедамі, якія, відаць, многае што ўмелі рабіць і рабілі добра.

Прывознымі рэчамі былі найболей прадметы раскошы і чужаземныя манеты. Гэтых апошніх у курганох знойдзена вельмі многа. Тут ёсьць і грэцкія, і арабскія, і індускія, і балгарскія, і варажскія, і нямецкія, і рымскія, і навет кітайскія манэты. Аб чым-жа яны сьведчуць! Якою дарогаю яны лучылі да нас? Адказ на гэта зусім просты. Нашыя прадзеды вялі гандаль блізу з усім сьветам. Чужаземцам яны прадавалі свае тавары, як сыр'ё, так і вырабы, ад чужаземцаў-жа куплялі іх тавары. Тавары або мянялі на тавар-жа, або прадавалі за грошы. Такім парадкам у нашых прадзедаў маглі быць манеты ўсіх краёў, з якімі вёўся гандаль. Для разьвіцьця гандлюў нашай староны былі ў той час вельмі выгодныя варункі. Цераз Беларусь праходзілі дарогі, па якіх ішлі тавары з Заходу на Усход — з Эўропы ў Азію і наадварот. Гэтымі дарогамі, па якіх амаль ні выключна вазілі тавары, былі рэкі, вазёры і моры, бо на сухапуцьці перашкаджалі лясы і была небясьпека ад разбойнікаў. Па Дняпру, Прыпяці, Нёману, Дзьвіне і іх прытоках ішоў жывы рух тавараў, пагружаных на судны. Летапісец Несьцер у сваёй знамянітай летапісі называе гэтую водную дарогу, якая праходзіла цераз Беларусь і зьвязвала Эўропу з Азіяй, „вялікім водным шляхам з Варагаў (г. знач. Скандынавіі) у Грэцыю“ Варагі і Грэкі былі найлепшымі купцамі таго часу, у руках якіх быў гандаль амаль ні ўсяго сьвету. Дык няма дзіва, што нашы прадзеды, пражываючы на вялікай воднай дарозе таго часу, мелі магчымасьць ня толькі гандляваць з усім сьветам, але і адчуваць на сабе ўплывы як заходняй так і ўсходняй культуры.

М. Кахановіч.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

В. Язова Міцкунскай гміны, Віленскага пав.

Зусім сьвядомых беларусаў у нас няма, але прыхільнасьць да беларускага руху вялікая. Жывуць тут адны каталікі, але папольску не гавораць і ня ўмеюць гаварыць, навет падсьміхаюць з тых, што хочуць хварэць на паноў і, пайшоўшы ў гміну куды „на людзі“, саромяюцца свайго роднага.

Ураджай сёлета добры.

Школы, пакуль што, тут ніякай няма, але мае быць у двары Язове польская школа. Неўсьвядомленыя сяляне слаба разьбіраюцца ў тым, якой ім школы патрэба; ёсьць навет такія, што ім зусім мала клопату да школы. Яны кажуць: „Дзяды ня ўчыліся і нам не патрэбна, бо на школу толькі цягнуць з нас грошы. А там сядзіць вучыцель, пан, нічога ня робіць, а там яшчэ інспэктар, жонд іхны, і ўсім плаці... Дык лепей бяз школы“.

Вось якая пануе цемната.

Ад в. Язова да Вільні ўсяго 22 вярсты. Яна знаходзіцца побач з в. Чарнулішкі, адкуль родам вядомы беларускі дзеяч Браніслаў Тарашкевіч.

Свой.

В. Дзяданішкі Міцкунскай гміны, Вілен. пав.

У нас жывуць беларусы-каталікі. Есьць некалькі сьвядомых людзей, каторыя стаяць за сваё роднае і добра абараняюць беларускія справы. Есьць, аднака-ж, і цёмныя, што слухаюць розных агітатараў, прасьледуючых усё беларускае. Школы ніякай няма. Была так рок прыватная польская школа, у якой вучыла надта добрая вучыцелька, каторая была ніякая праціўніца ўсяго беларускага. Любіла беларускія кніжкі, вершы, але як пажылая кабета не магла ўжо навучыцца пабеларуску. Цяпер у Дзяданішках скарэй што ня будзе школы, большыя дзеці будуць хадзіць у м. Лаварышкі, а меншыя застануцца так.

Падарожны.

В. Палянкі Шумскай гміны, Віленскага пав.

Беларусь тут самая чыстая. Мова не сапсутая, ні спольшчана, ні зрусманена, самая жывая наша, „простая“.

Гаспадары жывуць бедна за нядахваткай зямлі. Зямля ў вузенькіх шнурках, якія цягнуцца некалькі вёрст. Побач з нашай вёскай ляжыць двор Шумск графіні Камарыхі. Так рок згарэла ў яе гумно ад няведамай прычыны. Але паня Камарыха мела злосьць на аднаго чалавека з в. Палянак, і яго забралі ў турму. Многа дворнай зямлі Камарыхі ляжыць дзірваном, хоць людзі ня маюць на чым працаваць і ўзяліся-б урабіць дворную зямлю, каб паня аддала па даступнай цане.

Людзі ў в. Палянках сусім несьвядомыя, яны ані да Польшчы, ані куды; ім абы жыць дзісека добра. Кажуць:„ Хай Беларусь, хай Літва, хай Польшча, абы жыць было вольна, каб не адбіралі дабра, не ганялі ў фурманкі, не забіралі ў салдаты“.

У Палянках летам быў пажар; згарэла 10 хат.

Мужык.

С. **Міхалоўшчына** Гальшанскай гміны, Ашмянскага павету.

У сяле Міхалоўшчыне Гальшанскае гміны, Ашмянскага павету, у прошлым годзе была беларуская пач. школа, якая мела каля 80 вучняў. Школа мела адпаведны будынак і інвентар. Вучыцель школы п. Данілевіч, дачуўшыся, што Гальшанская гміна сёлета ухваліла там школу польскую, ваюружыўся прыгаварам ад сялян на далейшае істнаваньне беларускае школы і паслаў яго інспэктару ў Ашмяну. Праз некалькі дзён ад інспэктара прыехала ў Міхалоўшчыну польская вучыцелька і загадала ўсім дзяцём школьнага ўзросту запісвацца ў школу польскую, а хто адмовіцца, з таго 1000 марак штрафу. Сяляне, будучы ў крытычным становішчы з баязьні заплаціць 1000 марак, прымушаны былі паслаць сваіх дзяцей у школу польскую. Школа беларуская перастала істнаваць, а вучыцеля Данілевіча інспэктар пераназначыў польскім вучыцелем той-жа школы.

Тутэйшы.

Валожынская воласьць.

Калі беларускія гаспадары Валожынскай воласьці дачуліся, што „беларускіх школ у гэтым годзе зусім ня будзе“, дык сталі з усіх вёсак, дзе жывуць адны толькі беларусы, падаваць заявы з просьбаю да пана Валожынскага інспэктара, каб дазволіў мець школу на сваёй роднай мове, у якіх яны хочуць вучыць сваіх дзяцей. Але пан інспэктар ня хоча такіх заяў прынімаць, кажа: „Няхай пацьвердзіць войт гміны“. А як пацьвердзіў войт, дык пан інспэктар знайшоў другую адмову, што да яго гэта не датычаць, а трэба падаваць у гмінную раду; калі гмінная рада вынясе такую пастанову, каб былі беларускія школы, дык тады, можа, можна будзе нам мець свае школы. Покуль-жа тая гмінная рада зьбярэцца, чэраз месяц ці пазьней, пан інспэктар стараецца там, дзе былі беларускія школы, адчыніць польскія, ня гледзячы на тое, што сяляне чужой для іх польскай школы ня хочуць.

Валожынец.

Мёры Дзісьненскага павету.

У нас цяпер, як шмат каму ужо ведама, працуе ксёндз Асьціловіч, ненавісьнік беларускага адраджэньня. Ен ня так даўно зрабіў фальшывы данос на кс. В. Шутовіча, вядомага беларуса, пробашча ў Барадзенічах, якога духоўная ўлада заклікала ў Вільню і нат' думала пакараць, але хутка агледзілася, што кс. Асьціловіч панапісаваў на яго адны толькі глупствы, дык так і асталося. А брыдка даносамі займацца! Хоць яму гэта ніпачом. Ен прасьледуе беларускасьць, як толькі можа, і ў гэным прасьледаваньні, так як і ў даносах, робіць глупствы, бо, напрыклад былі такія здарэньні, што кс. Асьціловіч загадаваў бабам (так яны мне казалі) маліцца Маці Божай, каб беларусы навярнуліся на польскую веру. Адзін сьмех!

СОНЭТ.

Ксяндзу Пятроўскаму ахвярую.

Сіроткай гдзесь у полі вырас колас,
Адлучаны ад родных сваіх ніў,
Галоўку сумна ён сваю схіліў
На тоненькай саломінцы, як волас.
Ці чутны каму жальбы яго голас?
Хоць ён ня бачыў шчасьця цэлы век,
Хоць з градам дождж яго часамі сек
І вецер гнуў яго тагды у полаз
. . . .
Няшчасны, бедны, згнаньнік адзінокі!
Хоць сьвет для ўсіх такі цяпер шырокі;
Табе на ім мейсца ёсьць адно!
Ня жалься, брат, ня траць там сіл напрасна,
Загляне сьвет ў тваё турэмнае вакно
І скончыцца судзьба твая няшчасна.

ЯНКА БЫЛІНА.

У лесе.

Лес вітаў нас нячутнымі словамі,
Нам сьмялалася неба празрыстае,
Над каронамі соснаў хваёвымі
Хмаркі таялі лёгкія, чыстыя...
Па узгорках, на травах жаўцеючых
Косы сонца гулялі, зьліваліся,
Па аўсох залатых, ужо сьпеючых,
Хвалі плаўна плылі, разьбіваліся...
Штось казаў бор... дубы нярухомыя
Слалі з ветрам нам шэпты забытыя,
І здаваліся такімі знаёмымі
Словы іх з мовай сэрцайка зьлітыя.

1921 г. Натальля Арсеньнева.

Жалобны звон.

У Божым храме званы зазьвінелі,
„Упакой са сьвятымі“ пяюць;
А мой муж на сьмяротнай пасьцелі,-
Яго цела ў магілу вязуць.
Я адна з ім, а болі — нікога:
Ня відаць ні сваіх, ні чужых,
Толькі ўперадзе крыж і дарога...
А як жыў, быў патрэбны для ўсіх.
Эго сілку, як п'яўкі, смакталі,
Ня лічылі і дзён, у гаду,
Усе толькі, як хлеб той, ламалі,
Яе чэрпалі ўсе, як ваду.
Дзень і ноч ён ня меў адпачынку,
Ні ён сьвята ніколі ня знаў,
А што-ж еў ён: траву ды мякінку
Ды халоднай вадой запіваў.
Ен бывала таму, хто ня мае,
Аддае свой пасьледні кусок,
А цяпер вот ніхто з іх ня дбае,
Што яго зарываюць ў пясок.
Як канчаўся, а я галасіла,
Ня ступіў ніхто ў хату нагой;
Я адна яму вочы закрыла
І адна я іду за труной.
А відаць, што на небе для Бога
Такжа-сама патрэбен ён стаў,
Калі сьпешне, мінуўшы другога,
За ім сьмерць з таго сьвету паслаў.
Зьяві, Божа, на мне сваю сілу:
Пашлі такжа Ты сьмерць і за мной,
Разам лягу я з ім у магілу,
Няхай разам засыпяць зямлёй.
Мне цяпер ўсё няміла на сьвеце,
Хоць нічога й няма у мяне.
Маё сонца мне болей ня сьвеце,
Яно сьпіць пад зямлёй у труне.
Маё сэрца ў магілу схавалі,
Маё шчасьце зарылі ў пясок,
Што я мела усё адабралі.
Навет хлеба пасьледні кусок.
Куды з гора цяпер мне дзявацца?
Да каго і куды я пайду?
Хто дась есьці, у што адзявацца,
Гдзе прытулак сабе я знайду?

1921 г. Паўлюк Мальва.

БУДКА № 175.

Паміж узгоркаў дзьве сталёвых зьмейкі,—
Упоперак іх крэсьляць шпалаў рэйкі.
Па бакох высокія стаўбы...
Пераезд. Рагаткі тры са дроту,
Па сьцянах сьляды шрапнэляў, шроту,
То сьляды мінуўшай барацьбы...
Ой, калісьці тут зьвінелі пчолы,
Жвава кулямёт страляў вясёлы,
Змагалася ваяцкая сям'я...
А цяпер навокал сьпее збожжа,
Ля крыніцы чырванее рожа,
Бо крывёй напоена зямля...

На старой дзялянцы

Куды ні глянь — гарматаў, мінаў шмат,
Аконы, рэйкі ды пячураў лісьсіх брамы,
На батарэі два лафэты без гармат —
Нямыя сьведкі незабытай драмы.
Адвіснуў дрот. Асыпаўся акоп.
У ягоным рве клубком вужакі ўюцца.
Няма людзей... ў чужыне земляробы...
Бог ведае, ці прыдзецца вярнуцца.

Алесь Смаленец.

Гутарка аб кладзе.

У самую безгодзіцу глыбокай восені, пад дажджом бесьперастанку і ўвечары, ехаў я ад станцыі Яшун Палескае чыгункі у бок вёрст за пятнаццаць.

Ехаў канчаць памер зямлі і праклінаў каморніцкую службу.

Дрогкія, убогія калёскі, калматая, слабасільная каняка і пануры, бедны віляньчук-фурманшчык не весялілі вока.

Лёгкае пальто пад дажджавой накідкай мала бараніла маё зяблівае цела ад пранізьлівае сьцюжы з ветрам, і я з жаласьцю глядзеў на акалелага вазьніцу ў кароткай і благенькай, зношанай капоце.

Вазьніца быў маўклівы; маўчаў і я, прыціснуты бясконцай чарадою невясёлых думак.

Пакуль цягнуліся ад станцыі ў сасновым лесе, нядоля ў зацішы здавалася яшчэ ня дужа прыкрай. Але вось патанулі мы ў туманным полі... Гусьцела цьма. Нямела мокрае надвор'е. Пужала чорная, бяз просьвецьця, марудная дарога. І я пачуў сябе няшчасным у жыцьці.

„Але, — думаў я сабе, — ёсьць па сьвеце яшчэ болей абяздоленыя людзі“. І прадставіў свайго фурманшчыка, які паедзе гэтаю-ж дарогаю назад адзін. Я добра павячэраю, сагрэюся і буду спаць, калі ён, бедны, будзе яшчэ калець на гэтай сьцюжы. Я мог-бы і ня мець падобнай падарожы, каб не ахвота праехацца у Вільню хоць трохі асьвяжыць мазгі; я зараблю за месяц цалковых сто або і паўтараста. А ён за тры чацьвертакі прымушан так цяжка пакутаваць.

— Ці часта вам трапляецца так езьдзіць? — спытаўся я азызлым ротам, з натугай вымаўляючы слова па слову.

— Як калі, — такім-жа чынам адгукнуўся мой фурманшчык; — як пасажыры ёсьць, тады і еду. То цераз дзень, то разы два на тыдзень.

— О, Божа мой. Няшчасны-жа вы чалавек.

— Чаго няшчасны? Бяз хлеба не сяджу, патроху зарабляю.

„Мабыць, зьвёўся з гаспадаркі і ўдаўся у фурманшчыкі, — падумаў я аб ім, — мабыць, няздатны гаспадар; такія незадачнікі бываюць між сялян“.

— Я, бач, панок, зямлі ня маю, конь — усё маё багацьце, — як-бы ўгадаўшы мае думкі, сказаў ён мне.

— То вы запраўды няшчасны чалавек...

— Чаго няшчасны? Я часам добра зарабляю.

— Калі-ж гэта вы так добра зарабляеце?

— Бывае. Пасажыры бываюць розныя.

— „На чай“ даюць?

— Даюць гасьцінца, а вось надоячы дык пяцьдзесят рублёў за тры вярсты заробіў.

Мяне зьдзівіла і зацікавіла, які такі шчасьлівы прыпадак скінуў яму з неба пяцьдзесят рублёў?

Я хацеў пытацца, але фурманшчык ажывіўся сам, і я прыслухаўся, што ён мне скажа?

— Відзіце, панок, вун там фальварак? — паказаў ён пугаю некуды ў бок.

Я, прызнацца, нічога апроч чорнай, мокрай цьмы, ня відзіў і, як ні напружаўся вачыма, ня мог зацеміць ніякага фальварку.

— Ну, дык што?

— Там жыў калісьці пан, які займаўся чараўніцтвам. Ен даведаўся, што ў тым сасновым лесе, што мы, вось, праяжджалі, французы закапалі скрыню грошы.

— Ну, ну?

— Дык вось шукаў ён таго кладу праз усё сваё жыцьцё, ды ніяк ня мог натрапіць. Так і памёр, нічога не знайшоўшы, але прадаў свой сэкрат немцам за граніцу. Відаць, я гэтых немцаў надоячы і вёз.

— Цікаўна!

— Але, панок, дужа цікаўна! Каб ведаў я, што яны, гэта, клад едуць шукаць, то не пяцьдзесят рублёў узяў-бы з іх.

— Значыцца, яны знайшлі? Кажыце папарадку ўсё.

— Што-ж тут казаць? Відаць, знайшлі, бо столькі грошы мне дарма ня кінулі-б. Прыехалі яны з вячэрным цягнікам, як вось, прыкладам кажучы, і пан. Прыехалі ўдваіх, высокія такія, з рыжымі вусамі, і гаворка ў іх ні польская, ні руская, а невядома што, падобна да жыдоўскай. Ды ня жыды. Са мною гаманілі ломана папольску. Па далікатнасьці відаць, што важныя паны і ня тутэйшыя. Дагаварылі яны, гэта, не таргаваўшысь, маю фурманку да фальварка, але прыехаўшы у бор, сказалі мне стаяць. З сабою-ж узялі якуюсь даўгую цяжкую торбачку — штрумэнты там былі

Бура папсавала касьцёл у Мёрах, нарабіла шмат шкоды, злыя языкі кажуць, што гэта Бог пакараў кс. Асьціловіча за прасьлед беларусаў. А хто дакажа, што гэта няпраўда?

Мёрскі парахвіянін.

Г. Нясьвіж.

I.

Дзякуй Богу, што прыждалі. Прамень праўдзівага сьвету заблішчаў і ў наша вакно. Дзеля нас, тутэйшых беларусаў, настала вялікае сьвята: у Нясьвіжы адчынілі беларускую жаноцкую гімназію! Зарадаваліся нашы дзяўчаткі, ды не ад таго і бацькі. Аднаго яшчэ не хватае — што ў гэтую гімназію ня прыймаюць хлапцоў, каторыя тэж надта хочуць вучыцца на роднуй мове. Усе цешаць сябе надзеяю, што не задоўга і хлапцом будзе можна вучыцца ў гэтуй гімназіі. „Цярпелі доўга—пацярпім і яшчэ крыху“.

„Мой моцны Божа! (казалі нашы грамадзяне) Чаму-ж гэта кожная птушка, жывёлінка, пшчолка, казюлька шчабеча, мяўкае, гудзе, зюзюкае свабодна, пасваему, і нікто ей таго не забараняе, бо гэта дала ёй натура. Няўжэ-ш наш беларус ня можа мець тых правоў, што маюць жывёлы, ня можа выказаць свайго смутку, крыўды, радасьці, просьбы і падзякі на сваей роднай мове?“

Бяз мала што ўсе народы гутараць, вучацца на сваей мове, адны беларусы ня мелі дагэтуль на тое права.

А можа нарэшце ня будуць глуміцца і сьмяяцца і з нашае мовы нашы ворагі, нашы здрайцы. „Благая тая птушка, катора сваё гняздо паскудзіць“. Хто доўга быў у паняверцы, пад чужым зьдзекам, той добра ведае, як дарага вырвацца на волю, той толькі нас і падтрымае і нам паспагадае.

Шчыра падзяка таму, хто даў пазваленьне на адчыненьне гэтай штолы, таму, хто клапатаў дзеля яе і таму, хто ахвяраваў сябе на цяжкую працу для бацькаўшчыны!

Няхай расьце дзеля карысьці наша маладая расьлінка, няхай расьце наша роднае дзіцянё! Атуліце-ж яго, браты беларусы, моцнаю апекаю і ня дайце збароць яго ворагам.

Ддзядзька Язэп.

II.

Сяляне ваколічных нясьвіскіх вёсак выносяць на сходах прыгавары аб адчыненьні беларускіх школаў, нездавальняючыся польскімі школамі, якія істнуюць у тых-жа вёсках.

У вёсцы Я с ь к е в і ч ы Нясьвіскім Школьным Інспэктарам паняй Пятроўскай, якая ў бытнасьць у Менску пры першай польскай акупацыі прыхільна ставілася да беларускага пытаньня, зачынена беларуская школа і звольнен настаўнік, праслухаўшы беларускія курсы у Слуцку у 1920 годзе, і на места яе адчынена польская. Але сяляне не здаволены гэтым і на сходзе ухвалілі прасіць п. Інспэктара, каб вярнулі ім беларускую школу, якую яны пазналі у леташнім годзе.

Ш.

III.

Ад беларускай люднасьці з ваколіц Нясьвіжа паступаюць просьбы на імя Утрымацеля і Дырэктара Нясьвіскай Жаноцкай Гімназіі, каб хадайнічалі перад адпаведнымі ўстановамі аб тым, каб беларускія клясы гэтай гімназіі былі зьмешаныя, у якіх атрымлівалі-б адукацыю у беларускім нацыянальным кірунку ня толькі іх дзяўчаткі, але і хлапцы. У ваколіцах Нясьвіжа няма сярэдняй школы для хлапцоў. У тым жа горадзе былая мужчынская гімназія, а цяпер Польска-Расейская дабілася таго, што іх навет уся гімназія зьмешаная.

Ш.

ці што, бо трохі дзынкала. Запалілі лікстрыцкі ліхтарок і падаліся з дарогі ў лес. І торбачку ўзялі з сабою. Чакаў я іх, мабыць, з гадзіну. Спачатку ня дзівіўся, бо, ведама, паны, ад іх усякіх штук увідзіш. Але урэшце дакучыла мне дужа — таксама дождж крапіў — ды і цікавасьць стала забіраць. Тут я і сьцяміў, што яны, гэта, клад шукаюць. Вярнуліся, гяргечуць паціхеньку між сабою і нештачка малое у руках адзін нясець. Другі нёс торбу, а гэты—штось завінутае ў чорную хустэчку, можа, тую скрыначку прангускую з грашыма. Што мяне зьдзівіла, то гэта—радасьці вялікай на тварах ня было відаць. Як і раней, гяргечуць паціхеньку, спакойна, між сабою і кажуць заварачываць назад. Я, вядома, завярнуўся і завёз назад на станцыю. Як-раз падходзіў і цягнік на Вільню, яны ўзялі білеты, далі мне пяцьдесят рублёў ды і паехалі сабе.

— Дзіўныя рэчы кажаце!—аж крыкнуў я. — Толькі як яны маглі знайсьці у лесе поначы, ня знаючы масцовасьці!

— Немцы, панок! Мудрыя галовы, хітрэйшыя і ад жыдоў. Забыўсь сказаць, што на вакзале яны ў нейкі плян глядзелі і стужку мерную якую-сь мелі пры сабе. А як іх вёз, то ўсё па зэгар *) пагляцалі, колькі ўехалі. Пыталіся ў мяне ломана папольску аб паваротках ад дарогі.

— Ай-я-яй! Чаму-ж вы не сказалі хоць станцыі начальніку, што немцы нешта ў нашым лесе адкапалі?

— Э, панок, лес гэты панскі, а зьвяжысь з начальнікам, яшчэ ў бяду якую трапіш... Далі мне пяць паперак, я і маўчу.

— Ну, а цяпер-жа вы шкадуеце?

— Чаго шкадую? На іхну долю, знацца, шчасьце. Трошкі, можа, і шкадую, што не папрасіў хоць сотню. Як мысьліце, панок, далі-б ці не?

— Ай-я-яй! — мог я толькі адказаць, бо запраўды ўпеўніўся, што немцы выкапалі клад, закопаны ў 1812 годзе прапцускім войскам.

Нядбаласьць кінула мяне; здавалася, як быццам пацяплела, як быццам пасьвятлела навакол. Хацелась бегчы даганяць штось, намалёванае выабражэньнем. Ды не надоўга...

Фурманшчык змоўк. Паволі сьціх і я. Каняка наша шлёпалась, як рак. Ноч яшчэ болей пацямнела, і падарожа ўзноў расьціла цярплівую нуду, маруду думак, безнадзейнасьць. Дождж прабіраўся за каўнер, пранізьлівая сьцюжа ежылась па сьпіне. За паўгадзіны апавяданьне фурмана здавалась даўнай, даўнай байкаю ці нечым відзеным уво сьне.

7/IX 1921. Максім Гарэцкі.

*) гадзіньнік

Беларускі тэатр на правінцыі.

Сарганізаваны Ф. Аляхновічам беларускі аб'езны тэатр распачаў ужо сваю дзеяльнасьць спэктаклем у Лідзе, які быў 9-га гэтага месяца. Пастаўлена была „Птушка шчасьця“, вядомая п'еска Аляхновіча, а пасля спэктаклю быў канцэртны аддзел, у якім выступіла балярына петраградзкага тэатру Магрэта Ніжынская.

Спэктакль тэатру Аляхновіча быў першым беларускім спэктаклем у Лідзе, дык няма дзіва, што ня толькі ўсё беларускае грамадзянства прышло ў тэатр, але і шмат польскага. П'еса зрабіла добрае ўражаньне: публіка шчыра сьмяялася з клопатаў Янкі і сварлівай Маланкі, прымушаючы артыстаў бісаваць. На першым месцы трэба адзначыць аўтора п'есы, які ў ролі Янкі ўжо ў першым акце здабыў сымпатыю ў публікі. Вельмі добрай яго партнэршай была п. Случчанка, якая стварыла дасканальны тып сварлівай жонкі. П. Шчасны, граўшы ролю Жыда, меў вельмі ўдачны грым і граў надта добра, умела зрабіўшы трудны пераход ад камізму да лірізму ў 3 акце. Трохі бледна правёў сваю ролю артыст, які граў Лясуна.

Асобна трэба адзначыць канцэртную частку праграмы вечара, у якой выступіла балярына петраградзкага тэатру Магрэта Ніжынская.

Публіка была захоплена танцамі, каторыя з мастацкага боку былі бяз ніякай заганы. Аплёдысмэнтам не было канца.

Адным словам гэты спэктакль быў нязвычайным зьявішчам у Лідзе, і трэба спадзявацца, што чарговы беларускі спэктакль прыцягне яшчэ шмат болей публікі. Тыя, што дагэтуль аднасіліся з нявераю да беларускіх культурных здабычаў, асабліва да беларускага тэатру, пераканаліся, што беларускі тэатр на правінцыі можа мець грунт для свайго істнаваньня.

К.

Страшныя рэзультаты.

У той час, як Незалежная Літва і Польская Рэспубліка паважна і культурна спрачаюцца за Вільню і Віленшчыну на вачху ўсяго цывілізаванага сьвету, рэакцыйная віленская прэса, забіраючы ўсё большую моц і зусім дзічэючы ад бяскарнасьці з боку лішне цярплівай да яе ўлады, вядзе прост пагромную агітацыю супроць няпольскага тутэйшага грамадзянства і часта агідным спосабам накідаецца навет на палякоў, не жадаючых думаць пачарнасоценнаму і запраўды дбаючых аб лепшай будучыні роднага краю. Болей-меней паступовая польская прэса пад гэтым шалёным націскам часта маўчыць там, дзе трэба крычэць на ўвесь голас, бо яна баіцца аславіцца непатрыятычнай у цяперашні час. Яна маўчыць навет аб страшных і дзікіх выпадках, якія сталіся ў Вільні ў адносінах да тутэйшых ліцьвіноў за астатні час. Тымчасам, гэтыя выпадкі, памысныя для рэакцыянэраў—страшэнная ганьба для ўсяго нашага краю і яго гісторыі. Аб іх няможна маўчаць, каб нашы патомкі справядліва не адвярнуліся-бы ад гісторыі нашых дзён, каб увесь культурны сьвет не паставіў-бы ўсіх нас побач і роўна з тымі рэакцыянэрамі, смакуючымі гэтыя выпадкі. Так ці гэтак, а ўсім нам прыдзецца жыць разам... Да чаго-ж могуць давесьці гэткія выпадкі? «Rzeczpospolita» уважае, што яны давядуць польскае грамадзянства да самых лепшых рэзультатаў. Але паслухаем, што кажуць, з другога боку, віленскія ліцьвіны, каб пераканацца, як далёка „Жэчпосполіта“ ад праўды і справядлівасьці і да якіх рэзультатаў даводзіць агітацыя гэтай згубіўшай астаткі сораму газэціны. У віленскай літоўскай газэце „Vilnius“, заўсёды ўздержаннай і спакойнай, знаходзім гэткі артыкул, напісаны з прычыны падзеяў 1-га кастрычніка ў Вільні. „Vilnius“ піша:

„Перад трыццацьцю гадамі ўся Літва і амаль ня ўвесь сьвет былі да глыбіні ўзрушаны і абураны весьцю аб зьдзеках у Крожах. Казакі, пакліканыя праз Ковенскага губэрнатара Клінгенбэрга, драталі і бязьлітасна секлі жмудзкі народ, які бараніў ад іх свой касьцёл. Усё грамадзянства,—ня толькі літоўскае, польскае і іншае, а навет расейскае, - выразіла свой спогад тым, што пацярпелі; а мучыцелям-катам—сваю пагарду і ненавісьць. І толькі асьлеплены, здурэўшы расейскі ўрад выступіў ня проці Клінгенбэрга і ягоных казакоў, а проці кражанскіх мучанікаў, бо іхні паступак быў нібыта „сопротівленіем властям“. І адны і другія, - і каты і іхныя ахвяры-кражанскія мучанікі; Клінгенбэрг са сваімі злыднямі і кражанцы,- трапілі на карты гісторыі, скуль ніякая моц не здалее іх сцёрці.

Ішлі, плылі гады. Ярмо расейскага царызму душыла нас; мы паспрабавалі на сваіх плячах усяго; аднак, Кражанская гісторыя сваей брыдасьцю перайшла усялякі зьдзек: бо там секлі безаружных за іх пераканаьні і іх прывязнасьць да свайго касьцёлу. Аружжа проці голых грудзей!

Ішлі гады за гадамі. Мянялася жыцьцё, мяняліся й людзі. Урэшце наступіў дзевяцьсот пяты год. Забраны Кражанскі касьцёл вярнулі народу. Успыхнула Вялікая Вайна. Нямецкая акупацыя. Цяжкая, немагчымая да перанясеньня, бязуважная. Аднак, імгла ўжо разьвеявалася. 1919 год. Літва ўжо ішла да свабоды, і толькі ў паўночнай Літве—на Жмудзі - аж да познай восені аставаліся яшчэ немцы, салдаты Бермонта. І вось быццам пярун ударыў у пагодны дзень:- Літву абляцела вестка аб другіх Крожах: 30-га верасьня нямецкія афіцэры і салдаты, бязьлітасна б'ючы і сякучы, выгналі літоўскіх вучняў з шавельскай гімназіі і з гімназіяльнага будынку зрабілі казармы. Безаружныя вучні бараніліся гімнам на вуснах: „Lietuva tevyne musu“ (Літва, бацькаўшчына наша!). Не абаранілі яны сваей дарагой школы, так, як і Кражанцам не ўдалося адбараніць касьцёлу; аднак, як адны, так і другія выказалі перад сьветам моц літоўскага характару; тое, што яны апіраліся толькі на сваё моральнае права справядлівасьці і праўды, і ўрэшце вышэйшасьць гэтага права над кулаком і папяровымі прыказамі. Навет сярод прускіх салдатаў знайшліся такія, што схіліліся перад праўдай і ня згодзіліся біць дзяцей. І гэта безаружная праўда ізноў зваявала: неўзабаве пасьля гэтага немцаў выгналі, і літоўскія дзеці йзноў атрымалі сваю школу.

Ня стала маскоўцаў і прусакоў на нашай зямлі; здавалася, што з імі разам згіне зьдзек, гвалты і права кулака, якім азначалася іхнае панаваньне. Мы, віленцы, папалі пад панаваньне польскае. Кажуць нам, што гэта свае, каталікі, браты... Ня гледзячы на салодкія словы, бывае нам з імі ўсяляк: то сьпіраемся, лаемся, то ізноў радзімся, як дайсьці да згоды; ня сяньня, дык заўтра, здаецца, пагодзімся, і пачнецца жыцьцё людзкае, братняе, спакойнае. І шукаем адны між другімі людзей, што вялі-б нас да згоды, ламаем сабе галовы над тым, як-бы гэта пракласьці дарогу да паразуменьня. Аднак, ёсьць і такія, якім гэта паразуменьне не на руку, якія прад нічым не затрымаюцца, абы толькі спыніць работу, што вядзе да згоды і выкапаць вечную бяздонь ненавісьці паміж палякамі і ліцьвінамі. І вось — трэція Крожы, у якіх мейсца маскоўцаў і прусакоў занялі — на бяду — палякі!.. Бо толькі Крожамі можна назваць выпадкі, якія здарыліся 1-га кастрычніка г. г. у літоўскай гімназіі ў Вільні.

30-га верасьня—другія ўгодкі гэнай бясслаўнай „работы“ прусакоў у Шаўлях. Дык не бяз прычыны пеўны супрацоўнік літважэрнай газэты „Rzeczpospolita“, расьсеўшыся нахабна дамагаўся, каб якраз у гэты дзень выгнаць віленскую літоўскую гімназію з яе будынку: ці не прыгатовіў ён сьвята гэтым угодкам, сам напалавіну немец, напалавіну паляк, жадаючы „зблізіць паляка з прусаком“, другія Крожы дапоўніць трэцімі? А можа быць, што пагалоскі, якія шырацца (разам з пагалоскамі, што Пілсудскі цяпер нападзе на Незалежную Літву?), быццам Коўня ізноў зачне перагаворы з Варшавай, ізноў пачне шукаць дарог да паразуменьня,—некамусь паказалі, што для ягонай улады наступае канец і дзеля гэтага трэба канец гэты адсунуць; а гэта йзноў прымушае брацца за ўсялякія спосабы, абы толькі перарэзаць дарогі да згоды. Як будзе, так будзе, аднак, з прычыны выпадкаў першага кастрычніка,— з прычыны пагрому літоўскіх вучняў у Вільні, і слаўнай традыцыі Крожаў, — яшчэ на доўгі час адложана літоўска-польскае паразуменьне; урэшце працаўнікі яго дачакаліся нязвычайнай удачы: ухапілі Вільню ад ліцьвіноў.

Сярод віленскіх ліцьвіноў—ня гледзячы на тое, што шмат з іх пацярпела ў сяньняшніх палітычных варунках — былі яшчэ наіўныя, што ня верылі, каб палякі (трэба разумець пеўны крайні элемэнт?—Рэд. „Бел. Вед.“) пакусіліся на сьвятыню літоўскай культуры — гімназіяльны будынак. Літоўцы рэмантавалі гэты будынак, парадкавалі яго, мілавалі. Аднак, ужо летам атрымалі ведамасьць, што Дэпартамэнты Адбудовы і Асьветы вынясьлі пастанову „зьніштожыць віленскія гнёзды літоўскасьці“, — гімназію, вялікі прытулак і інтэрнат для дзяўчат. Аднак, ня гледзячы на ўсё, гэтаму не давалі веры: бо мы-ж маем справу з палякамі, не з прусакамі і не з маскоўцамі! Пасьля мы сталі атрымліваць паперы, жаданьні,— але яшчэ і тады не хацелася верыць; мы тлумачылі, што мы працуем, пашыраем асьвету, бяз гэтага будынку працаваць не-магчыма,—ды і хто-ж захоча вырваць нас з гэтай культурнай працы?! Дык пісалі, высьнялі... Польская прэса чарнасоценнага кірунку пачала гвалтоўную атаку проціў літоўскіх установаў, пачала кідаць на іх няславу, фальш, ліцьвіны не маглі адбараніцца, бо ім забаронена выдаваць іх газэты ў польскай мове.

І ўсёжткі наіўныя цьвярдзілі: праўда павінна ўзяць верх! І толькі некалькі асоб, асабліва тыя, што вышлі з паміж польскага грамадзянства, або пазналі палякоў (пеўны крайні элемэнт?—Рэд. „Бел. Вед.)“ лепш, як другія, усьцяж прасьцярагалі сваіх: „Ці-ж вы ня знаеце палякоў?“ І гэтыя не цамыліліся.

1-га кастрычніка г. г. а 2-ой гадзіне з паўдня, неўзабаве посьле таго, як разыйшліся па лекцыях вучні гімназіі, і ў тым часе, як пачалі зьбірацца да гімназіяльных клясаў пасьляабедныя вучні—слухачы вучыцельскай сэмінарыі і вучні мястовай школы,—у гімназію увайшла паліцыя і азнаёміла дырэктара гімназіі п. М. Біржышку, што яна ня ўпусьціць ніводнага вучня ў гімназію. Пры ўваходных дзьвярох паставілі варту. У гадзіне 3 з палов. зьявіўся прадстаўнік Дэпартамэнту Адбудовы Маркевіч,—аб якім успаміналася ўжо ў заметцы „Хамства“ і які называе сябе інжынерам, — з некалькімі чыноўнікамі, прадстаўніком Дэпартамэнту Асьветы Пржэменецкім (каторы ўцёк з Коўні), ад імені польскай гімназіі Лелевэля з дырэктарам гэтай-жа гімназіі Жэльскім і іншымі „педагогамі“ і не педагогамі, з цэкым пукам паліцэйскіх. На жаданьне гэтых паноў, каб гімназіяльны будынак аддаць у рукі дырэктара польскай гімназіі, М. Біржышка адказаў, што ён пратэстуе проці няпраўнага і несправядлівага адбіраньня будынку ад ліцьвіноў, і заявіў, што ён адказываецца памагчы ім у чым-колечы пад час заняцьця гімназіяльнага будынку. Словам, заняў такое становішча, якое ўжо месяц перад гэтым было сьцьверджана на паперы.

Не згадзіўся ён таксама зьвярнуцца да вучняў мястовай школы і вучыцельскай сэмінарыі, якія былі ў гімназіі, з прапазыцыяй, каб разышліся; кіраўнік-жа вучыцельскай сэмінарыі Я. Кайрукшціс згадзіўся толькі паўтарыць некалькі слоў, калі толькі сьпярша сам Маркевіч зьвернецца да вучняў. Гэта прамова п. Маркевіча ня мела ніякага скутку, вучні толькі крыху падаліся ўзад. Тады прыбыўшыя заняліся гімназіяльнай рухомасьцю.

З пачатку Маркевіч (з паміж ўсіх чыноўнікаў Дэпартамэнту толькі ён узяўся высяліць ліцьвіноў) заявіў, што ён мае прыказ вынясьці на панадворак усе мэблі, якія належаць да літоўскай гімназіі або да ейнага дырэктара, аднак, не знайшоў паслуху ў сваіх таварышоў і зьмяніў становішча. Аддзяліўшы кватэру дырэктара, ён загадаў сабраць там мэблі гімназіі і дырэктара, што яму, аднак, у працягу трох дзён зусім не ўдалося зрабіць. Першага дня удалося „спарадкаваць“, бяз помачы гімназіі, рэчы М. Біржышкі. Паліцыя старалася устараніць з гімназіі каля 150 курсістак вучыцельскай семінарыі і вучняў мястовай школы, якія там знаходзіліся, аднак, удалося гэта паліцыі толькі вечарам.

Досіць было наштурганых, самлелых, а нат' пакрываўленых дзяцей; аднак, моладзь моцна трымалася сваей школы, галасна пратэстуючы проці замаху на ейнае права вучыцца. У канцы вышлі, калі ўсё гэта ўжо кончылася, з гімнам „Lietuva, lėvynė musų“ на вуснах. Апошнімі былі выведзены паліцыяй каля 8-ай гадзіны ўвечары М. Біржышка з жонкай і з братам; сваіх дзяцей яны памясьцілі ў радні, а самі мусілі закватэраваць у готэлі.

Падчас гэтых выпадкаў каля гімназіяльных дзьвярэй стаялі ў працягу некалькіх гадзін вучні і вучыцялі літоўскай гімназіі; яны зьбегліся, як пачулі аб небясьпецы, што пагражала гімназіі. Паліцыя ня ўпушчала іх у сярэдзіну будынку. Увакол круціліся пастаронныя — шпіоны, вучні гімназіі Лелевэля, скаўты. Адны спаміж іх выражалі ліцьвінам свой спагад і абураліся на тое, што рабілася, а іншыя лаялі моладзь і пагражалі ёй. Заўважана, што збоку трымаліся вайсковыя, з выняткам даўнейшых гімназіяльных вучняў. „Адзначыўся“ таксама д-р Заёнчкоўскі, каторы пераждагнаўся вялікім крыжам (відаць вялікі гэта „каталік“!), як убачыў, што выганяюць літоўскую гімназію і голасна адазваўся: „Хвала Богу! Хвала Богу! Нарэшце!“ Аднак, бедачок недачакаўся найбольшага трыумфу, калі пад вечар літоўская моладзь пачала пяяць літоўскі гімн, а паліцыя прыкладамі, скаўты—кіямі (гэты апошнія прышлі ў найлепшым парадку біць ліцьвіноў), а некалькі п'яных вастрожных старажоў — упрост кулакамі пачалі біць літоўскіх дзяцей. Тут-то ўжо ўзапраўды лекар Заёнчкоўскі,—дый ня ён адзін, а ўся палудуркаватая віленская шушамець,—з уцехі зусім здурэла-бы, заводзячы сваё „Хвала Богу!“ Сярод літоўскай моладзі бадай, што ня было ані воднага, каторы не паспрабаваўбы смаку прыкладу або палкі: усе пацярпелі роўна, за выняткам тых, что пацярпелі больш ад іншых. Білі малых дзяцей, каторыя валіліся на зямлю: білі дзяўчатак! Б'ючы літоўскую моладзь, гналі яе да Віленскай вуліцы. Арыштавалі некалькі ліцьвіноў: вучыцялей Ст. Кайрукшціса і Ст. Нагінскаса (закідываюць ім тое, што ў часе, як пяялі гімн,—яны стаялі бяз шапак!), старшыню Бацькаўскага Камітэту Канст. Сташыса, вучняў 8-ай клясы Пацэвіча, Пэнкайціса і іншых. Стралялі да ліцьвіноў толькі адзін раз,—забітых ня было.

Дык вось пры помачы ўнутранай і знадворнай атакі на літоўскую гімназію, або судзячы з таго значэньня, якое гэтай афэнзіве прыдавалі польскія газэты, (ня ўсе, але пеўнага кірунку— Рэд. „Бел, Вед.“) што пад'юджывалі на гэта польскую адміністрацыю і шушамець, паўторна ўпрост выравалі ліцьвіноў Вільню.

Гэтым спосабам прыпамінаюць нам ізноў — Крожы.

Віленская літоўская моладзь мае сваю слаўную карту ў гісторыі літоўскіх мучальнікаў: безаружная (навет проці прыкладаў і кіёў не прынесла ані кіёў, ані камянёў), вытрымала; стойка бараніла сваіх правоў да сваей народнай школы, бараніла толькі сваей моцнай паставай, малайцаватым павядзеньнем, тактам, як гэта ў нашай старадаўнай песянцы бадраць жаўнера: „Tik stovek, ne drebek, i veluka, vis žiurik!“ („Стой, ня дрыжы, усё паглядай на сьцяг!“). І мы глыбока пераканаты, што гэта моладзь, якую нат найзаўзяцейшыя нашыя ворагі эндэкі хваляць за яе працавітасьць і вытрымаласьць, у будучыне яшчэ ня раз здалее публічна пацьвярдзіць сваю прывязнасьць да бацькаўскай мовы, бацькаўшчыны і народу. Валіо (vivat) дзяўчаты і хлопцы! Валіо, унукі Вітольда Вялікага!

Аднак, што-ж сказаць аб віленскім польскім грамадзянстве, аб Пячулісах, — Ліхтаровічах (п. Ліхтаровіч пеўне сам не спадзеваўся, што аж да гэтага дойдзе Рэд. „Бел. Вед.“) аб д-рах Заёнчкоўскіх, Маркевічах, Жэльскіх, аб „педагогах“, якія абпіраюць свае выгады на крыўдзе бліжняга, якія ня маюць стыду біцца з дзяцьмі, якія выгадавалі „скаўтаў“, каб яны з палкамі ў руках нападалі на сваіх братоў? Што сказаць аб польскай прэсе (пеўне-ж апроч тых журналістаў, якія толькі баяліся аславіцца непатрыятычнымі — Рэд. „Бел. Вед.“), якая праз ўвесь час пад'юджавала на ліцьвіноў, аж пакуль дачакалася пагрому нашых дзяцей, якая пеўне і цяпер кіне на пабітых дзяцей няславу? Што сказаць аб збыдлеўшых, праз агітатараў адпаведна настроеных віленскіх „інтэлігентах“ (апрача некалькіх п'яных, рабочыя плакалі і пратэставалі проці крыўды, якую зробілі літвінам; адзін жандар пасварыўся з міліціянтам за біцьцё дзяцей; але „інтэлігенты“ высказаліся зусім праз д-ра Заёнчковскага?)

Няго ніхто спаміж сумленных палякоў не скажа гэтым паном, што іхнае месца ў гісторыі— побач з Навасільцавым, Клінгэнбэргам і шавельскімі прусакамі, якім здаецца Обст выразна прыгатаваў абход угодкаў?

Мы ідзём выразнай, адкрытай і простай дарогай народнай працы. Вам, правадырам віленскіх палякоў (пеўнага рэакцыйнага элементу? — Рэд. „Бел. Вед“.) глядзём проста ў вочы — і ніякі прасьлед нас не запужае. Вам-жа астаецца: Стыд і ганьба“.

Больна, страшэнна больна чытаць гэткія артыкулы... Больна ня толькі за бязьвінна пабітых дзетак, ня толькі за пакрыўджаных самым дзікунскім спосабам літоўскіх грамадзян нашага краю, але больна за ўсіх нас, за ўвесь наш родны край, за тое ж польскае грамадзянства, якое маець на сваё і ўсіхнае ваша няшчасьце прыхільнікаў і дзейнікаў гэтых ганебных учынкаў! Як-ніяк, усе будзем жыць разам. Якую-ж будучыню мы рыхтуем і сабе і сваім дзеткам, што змалку дзён навучаюцца мець дачыненьне з кіямі ня як з за-

12

Сябры і грамадзяне! Складайце грошы на газэту, якая бараніць нашу народную справу. Зьбірайцеся гурткамі і выпісывайце яе на вёску хоць адзін экзэмпляр. Калі будзець больш падпісчыкаў, газэта станець на цьвёрдыя ногі. Не адкладайце падпісывацца, бо ад гэтага залежаць далейшае жыцьцё „Беларускіх Ведамасьцей“. Хто ня умее чытаць, хай просіць, каб яму прачытаў пісьменны сусед, або настаўнік, або сьвяшчэньнік, або старэйшы вучань беларускай школы. Зьбірайцеся грудам і чытайце разам. Вучыцеся бараніць нашы народныя справы. Памажыце газэце, якая з вамі і за вас адбіваецца ад нашых нацыянальных і соцыяльных ворагаў і працуець над разьвіцьцем роднае культуры. Лічыце сваім абавязкам скласьці хоць адну марку на агульную народную справу. Годзе нам спаць, годзе нам быць самым адсталым народам. Браты, прыміце блізка да сэрца усе гэтыя словы! Настаўнікі, пільнуйце, каб „Беларускія Ведамасьці“ у вашым раёне выпісываліся і пашыраліся. Хай жывець народная справа!

баўкамі, а як з жудасным арудзьдзем ненавісьці? Віленская польская прэса, якая лічыць сябе паступовай, павінна урэшце падвысіць свой голас вартаўніка грамадзкай сумленнасьці і культурнасьці, што зусім не пашкодзіць яе патрыятычным інтарэсам, — барджэй паможа! Усе мы жадаем згоды. Покуль-жа яе няма, будзем змагацца сумленна і культурна: адвернемся ад усяго таго, што нагадывае хоць бы каму-небудзь з нас самыя чорныя дні нашай ранейшай няволі, што так прыліпла да хваравітых сэрцаў рэакцыі і што кладзе ганебную пляму ня толькі на рэкцыянэраў, але на ўсю нашу супольную гісторыю.

Ад Рэд. Артыкул гэты паданы ў друк да выхаду нумара „Gazety Krajowaj“ з арт. паважанай п. Г. Ромэр.

ЭКАНАМІЧНЫ АДДЗЕЛ.

Цэны прадуктаў на рынках у Вільні 7-га кастрычніка былі такія: жыта пуд 2100 польск марак, ячмень 2400, гарох 3.000, бульба 550, капуста 750, буракі 500, морква 600, цыбуля 1400, хлеб чорны хунт 55, белы -80, мука жытняя пуд 2.300, пшонная 7.000, крупы ячменныя хунт 140, пярловыя 160, рыс 170, мяса ялавічына 200, сьвініна 310, саланіна 600, сала топленае 600, яйкі штука 26, масла кароўскае хунт 900, малако кварта 100.

У Дзісенскім павеце шмат каапертываў у апошні час зачынілася, дзеля таго што яны ня маюць гдзе даставаць тавары. Існуючыя каапературы без інструктарскай дапамогі маюць дужа нязначныя паі.

У Дзісенскім павеце за даляры можна дужа сходна купіць збожжа. Наагул сярод сялянства даляры ўсё болі і болі становяцца ходкімі.

Кааператыў „Мурашка“ у Залесьсі прыслаў у Віленскі Саюз Кааператываў на збыт семя альняное і авёс. Саюз па прадажы адлічаець сабе на арганізацыю да 10 проц. і ўсе атрыманыя грошы аддае кааператывам, прыслаўшым збожжа на збыт.

Цэны на розныя тавары, атрыманыя з Гданску, настолькі вялікія, што ў Вільні на большасьць тавараў яны ніжэй процэнтаў на 30, дзякуючы нізкасьці польскай маркі. У гандлёвых колах гавораць, што вываз у Польшчу тавараў з Гданска зьменшыўся на 70 проц., дзеля таго што польскі рынак стаў значна таней, як гданскі.

8 кастрычніка ў Дукштах Браслаўскага павету былі вось якія цэны: жыта 1600-2000, пшаніца 2200, ячмень 1200-1300, сена 150, авёс 1300, салома 50, бульба 350-400, семя альняное 2500, цыбуля хунт 200, гарох 1400, морква 300, мяса ялавічына 120, хлеб чорны 60-85, масла кароўскае 700, яйкі 18, сыры 100, бараніна 110, капуста 400-550, Вываз у Вільню забаронены.

У Маладзечанскім раёне 8 кастрычніка былі гэткія цэны: жыта 1800, ячмень 1750, салома 340, бульба 400-420, цыбуля 1700-1820, мяса ялавічына 145, хлеб чорны 60 м, саланіна 500, масла 800, яйкі 20, сыры 210.

10 кастрычніка ў Опсе, Браслаўскага павету былі вось якія цэны: жыта 1600-1700, пшаніца 2200, ячмень 1200-1300 м., авёс 1300-1400, салома 60, м., бульба 250-300, мёд 300-325, семя альняное 2000-2100, гарох белы 1500, морква 300, буракі 250- 300, грыжа 300, мяса ялавічына 120-130, м', свініна 150-160, яблыкі зімовыя 1200, масла 650-700, яйкі 14-15, бараніна 120, капуста 250-300,

Залескі Аддзел Віленскага Саюзу пачаў абмен солі і карасіны на бульбу. Гэтым пунктам ужо выслана ў Вільню 2 вагоны бульбы. Абмен ідзе далей. (Kooperacja)

За апошні тыдзень ад 9.-X. да 16.-X. Віленскі Саюз кааператываў атрымаў з сваіх Аддзелаў: 3 вагоны прадуктаў. З іх 2 вагоны бульбы, а рэшта: жыта, буракі, цыбуля, капуста, ячмень, авёс і інш.

Дзісенскі і Дунілавіцкі паветы ня маюць нафты. Сяляне па даўнейшаму сядзяць пры лучыне. Хунт нафты ў прыватным гандлю каштуе 100 марок.

(Kooperacja).

ХРОНІКА.

Беларусы! Каму дарагі справы роднае культуры, усе, як адзін, запісывайцеся ў Таварыства Беларускае Школы. Запісывацца можна ў Віленскай Беларускай Кнігарні (Завальная, 7), а з правінцыі—прыслаўшы пісьменую заяву ў Таварыства (Вільня, Вострабрамская, 9). Выпісывайце Статут Таварыства. Чым болей будзе сяброў у Таварыстве, тым лягчэй будзе разьвіваць беларускую асьвету. Запісацца можаць і павінен кожны: інтэлігент, селянін, работнік.

Ковенская беларуская грамада зьбіраецца адчыніць на гэту зіму беларускую пачатковую школу.

Пераехаўшая на заўсёднае жыцьцё ў Коўню з Варшавы беларуская мецэнатка княгіня Магдалена Радзівілова ахвяравала Ковенскаму Мястоваму Музэю 12 старадаўніх беларускіх златканых паясоў, якія ўжо выстаўлены дзеля агляду.

Віленская расейская жаноцкая гімназія п. Пасьпелавай запрапанавала вядомаму беларускаму педагогу, б. рэдактару „Незалежнай Думкі,“ п. Генадзію Багдановічу выкладаць у гімназіі беларусазнаўства, прычым на гэтую навуку даюцца лекцыі толькі ў аднэй клясе. П. Генадзій Багдановіч згаджаецца з тым варункам, што беларусазнаўста будзе заведзена ува ўсіх клясах гімназіі. Будзем спадзявацца, што п. Пасьпелава урэшце зразумее, дзе і ў якім часе яна жывець, а ўзяўшы пад увагу тое, што ў яе гімназіі вучацца амаль ня выключна дзеці беларусаў, яна прынамся згодзіцца на думку п. Генадзія Багдановіча, калі не перавядзе малодшыя клясы зусім на беларускую мову.

Бышы рэктар праваслаўнай духоўнай сэмінарыі на Валыні ігумен Піліп прыехаў у Вільню і заняўся педагогічнай дзеяльнасьцю ў Літоўскай духоўнай праваслаўнай сэмінарыі. Ігумен Піліп умее ўкраінскую мову і цяпер вучыцца беларускай.

Рэктар Віленскай прав. дух. сэмінарыі Вячаслаў Багдановіч у мінулую нядзелю, 9-га кастрычніка (па старому стылю 26 верасьня - акцябра), у сьвята Івана Багаслова сказаў у беларускай царкве Сьв-Троіцкага манастыра, з прычыны прастольнага сьвята аднаго з прыдзелаў царквы, урачыстае казаньне на беларускай мове.

Дзеля ўдвое перавышаючага норму ліку вучняў у 3 клясе 1-й Віленскай Беларускай Гімназіі, кляса ў гэтым годзе падзелена пастановаю Педагогічнай Рады Гімназіі на дзьве клясы; такім чынам, цяпер у Гімназіі тры паралельных клясы, 1-я, 2-я і 3-я.

Для вучняў з правінцыі каторыя спазьніліся дзеля важных прычын прыехаць у Вільню к пачатку школьнага року, прыём прашэньняў адчынен на далейшы час.

Для прыезных вучняў 1-й Віленскай Бел. Гімн. адчынен інтэрнат.

Пяяньне выкладаць у 1-й Віленскай Бел. Гімн. згадзіўся і ўжо дае лекцыі вядомы арганізатар беларускіх хораў і гарманізатар народных песьняў п. Ф. Згірскі.

Ахвотнікі іграць у струнным аркестры Віленскага Беларускага Музыкальна-Драматычнага Гуртка яшчэ прыймаюца. Запісывацца можна ад 4 да 6 гадзіны — Біскупская вул. (пры Катэдральным пляцу), д. № 12, кват. 6. Інструмэнты ёсьць на 40 чалавек.

Год назад адна Віленшчына мела каля 200 беларускіх школ. Потым, калі абшар Сярэдняе Літвы быў абрэзаны, беларусы мелі тут 4-5 дзесяткаў школ. Ашмянскі павет меў да гэтага часу 24 беларускія пачатковыя школы. Цяпер там, дзе гмінныя рады не адпявядаюць праву выбарнасьці і ворага настроены супроць беларускасьці (прыкладам, у некаторых чыста беларускіх і праваслаўных воласьцях Рада ня мае ў сваім складзе ніводнага беларуса), пры разьмеркаваньні школьных пунктаў, ухвалены замест беларускіх школ — польскія, або зусім скасован школьны пункт. На моцы гэтакіх ухвал Ашмянскім школьным інспэктарам 1-га кастрычніка зачынена 11 беларускіх пачатковых школ: 6 у Гальшанскай гміне, 3 у Беніцкай і 2 у Крэўскай, Усе вучыцялі звольнены. Кожная школа у свойчас падавала школьнаму інспэктару пастанову сялян аб далейшым істнаваньні гэтых беларускіх школ у быўшых пунктах, на што школьная ўлада не зьвярнула ніякае ўвагі.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Педагогічная Рада 1-ае Віленскае Беларускае Гімназіі пачала арганізаваць папулярную і навуковую бібліатэку для сваіх вучняў. Да апошняга часу справа гэта стаяла так: кніг было мала, а падручнікаў і навуковых кніг было яшчэ менш. Цяпер Педагогічная Рада хоча папоўніць гімназіяльную бібліатэку кнігамі і падручнікамі па ўсім краінам знацьця, каб даць дзецям вельмі незаможных, бедных бацькоў магчымасьць карыстацца патрэбнымі навуковымі падмогамі.

Грамадзяне, афяруйце грошы, прыносьце і прысылайце кнігі. Кожная новая кніга зьменшыць сучасную, нячуваную дагэтуль патрэбу ў навуковых падмогах, пашырыць беларускую асьвету.

Афяры грашмі і кніжкамі на усіх мовах прыймаюцца што дзень у час лекцый (9-2 г.) ў будынку гімназіі—Вострабрамская 9, Загадчыкам Бібліатэкі, вучыцелем М. Красінскім.

М. К.

Арганізатар «Краёвае Сувязі» п. Аляксюк прыслаў генаралу Жэлігоўскаму такую дэпешу:

„К угодкам гістарычнага дня, калі армія Пана Генарала, уваходзячы ў нашу спрадвечную сталіцу Вільню, скінула кайданы перамогі і гвалту з роднага краю, беларускія прадстаўнікі шлюць правадыру вялікага ўчынку паздараўленьне і просяць мець веру, што яны гатовы разам з усім людам Віленшчыны змагацца за права і справядлівасьць. Старшыня Дэлегацыі Аляксюк.“

Віленская палякафільская газэта на беларускай мове „Jednaść“ адчасу-дачасу яшчэ друкуецца, а яе таварышка „Родная Страха“ мабыць, як мы раней пісалі—сканала. А шкода, што замест „Страхі“ не сканала хоць-бы „Jednaść“, бо яна, як і газэта, не зважаючы на яе не-беларускую работу, пастаўлена дужа дрэнна, тымчасам як „Страха“ выгляд мела зусім нормальна-газэтны Прычыну, што „Страха“ раптоўна згніла, без дажджоў і непагоды, некаторыя бачуць у тым, што яе рэдактар Янка Бэкіш зьбіўся з тону і, нападаючы на першай страніцы на усё, на што накідываецца „Jednaść“, на чацьвёртай страніцы... уздумаў бараніць правы беларусаў на родную школу.

З Дунілавіцкага павету паведамляюць аб неспадзейных дзівах. Як вядома, там праяжджаў Начальнік Польшчы Пілсудзкі. Калі ён быў у Парафіянаве, да яго зьявілася настроеная астаткамі расейскага чарнасоценства дэлегацыя з просьбаю, каб для беларускага насяленьня былі адчынены расейскія школы. Што сказаў Начальнік Польшчы абкалпачаным дэлегатам, невядома, найскарэй—нічога не сказаў. Аднак, вярнуліcь яны з пеўнасьцю, што справа удалася. Тымчасам, цераз нейкі час прыехаў Дунілавіцкі школьны інспэктар і стаў гаварыць падпісаўшым просьбу аб расейскіх школах—нязвычайныя рэчы, зусім, як запраўдны беларускі школьны інспэктар, што ніякіх іншых школ ім непатрэбна, апроч родных беларускіх. Цяпер у Дунілавіцкі павет патрабуецца ўжо 15 беларускіх вучыцялёў, а ўсе людзі, як у звон б'юць: „Пілсудзкі сказаў, што школы буцуць беларускія!“

Калі Начальнік Польшчы Пілсудзкі быў у м. Глыбокім, дык польская дэлегацыя прасіла, каа атабраць у праваслаўных царкву на касьцёл. На гэта Начальнік Пілсудзкі адказаў, што тутэйшыя каталікі і таго касьцёла, які маюць, ня могуць дагледзець як мае быць, а ў праваслаўных адна царква, дык адбіраць яе не дазваляе.

Быўшы губэрскі камісар часоў Керэнскага (неакупаванай немцамі часткі Віленшчыны), Восіп Балай з Шаркаўшчыны, Дзісьненскага павету, высьвяціўся нядаўна на сьвяшчэньніка і заняў прыход у Залесьсі, таксама Дзісенскага павету.

Уступілі запраўднымі сябрамі ў „Т-ва Беларускае Школы“:

80) Я. Крыўка, 81) Зінаіда Крыўка, 82) К. Дзьмітрачэнка, 83) Уладзімір Скабей, 84) Сымон Маркевіч, 85) Аляксандар Плескачэўскі, 86) Караліна Плескачэўская, 87) Натальля Арсеньнева, 88) Г. Дварчанін, 89) Мікола Біляй, 90) Уладыслаў Грыневіч, 91) Надзея Аўсейчык, 92) Дзьмітрыеў, 93) Раковіч, 94) Ул. Міхалевіч, 95) А. Канчэўскі, 96) Адольф Клімовіч, 97) Ганна Кавэрда, 98) С. Малафееў, 99) Ул. Знамяроўскі, 100) М. Сянкевіч, 101) З. Пачопка, 102) Я. Пачопка, 103) Я. Тарчэўскі, 104) Кастусёнак, 105) Рамановіч, 106) Більдзюкевіч, 107) Н. Банцлебэн, 108) Н. Сасноўская, 109) Уладз. Гічан, 110) Прахор Хоцька, 111) Мервіч, 112) Пранц. Кушаль, 113) Тулоўскі, 114) Я. Цеханоўскі, 115) Андрэй Якубецкі, 116) Зося Пронька.

Прадстаўнікі Далёцкага кааператыва (Дзісенскага павету) 9-га кастрычніка прыехалі ў Вільню па тавары і замест таго, каб тавары набраць у Саюзе Кааператываў, пайшлі на Рудніцкую вуліцу купляць у прыватных гандляроў. Іх там завялі негдзе ў цёмны завулак і аграбілі на суму каля 200.000 марак,

Беларусаў, якіх не прапусьціла Кваліфікацыйная Камісія Унівэрсытэту Ст. Баторыя, просяць зьвярнуцца ў Цэнтральную Беларускую Школьную Раду—штодзенна ад гадз. 4½ да 6 на Вострабрамскай 9.

Прадстаўнік Польскага Інфармацыйнага Бюро „Е. Е.“ меў гутарку з п. П. Аляксюком, кіраўніком віленскай арганізацыі „Краёвая Сувязь“, якога, аднак, чамусь называе „прадстаўніком Цэнтральнага Беларускага Краёвага Камітэту“. Што гэта за камітэт, дзе ён знаходзіцца і хто яго выбіраў—невядома. У сваёй гутарцы п Аляксюк паўтарае вядомыя артыкулы „Жэчыпосполітай“ аб беларусах, што ўжо ня нова і ня цікава. Беларускі зьезд у Празе, з якога п. Аляксюка выставілі, як прадстаўніка не-беларускай арганізацыі, ён аслаўляе зьездам... нямецкіх агентаў, прыхільнікаў бальшавізму, быўшых расейскіх чарнасоценцаў і г. д. Складаецца з яго словаў такое ўражаньне, што на зьездзе ня было ніводнага парадачнага беларуса, апроч самаго п. Аляксюка. Самае важнае ў гутарцы—гэта войстры напад п. Аляксюка на п. Л. Дубяйкоўскага, адзінага паланафіла, якога п. Аляксюк яшчэ не пасьпеў адсунуць ад палітычнай працы. Мы пеўны, што п. Аляксюку удасцца зьесьць і гэтага астатняга канкурэнта, у чым жадаем яму ад шчырага сэрца... удачы!

Па дэкрэту Галоўнакамандуючага войскамі сярэдняе Літвы за № 349, Дэпартамэнт Гандлю, Промыслу і Адбудовы Края загадаў Епархіяльнай Радзе перадаць у казну 10 дамоў, якія нібы-та былі канфіскаваны расейскім урадам у 1864 г.; у тым ліку спамінаецца і д. № 9 на Вострабрамскай вуліцы (Троіцкі манастыр, у мурох якога зьмяшчаюцца розныя беларускія ўстановы). Епархіяльная Рада, маючы дакумэнты, што паказаныя дамы ніколі канфіскаваны ня былі, падала ў Часовую Урадуючую Камісію і Дэпартамэнт заяву, што загад Дэпартамэнта павінен быць скасован, як няпраўны.

Чародны нумар віленскай газэты „Nowiny Wileńskie“ сканфіскован і ня вышаў. Друк перакладу „Страхаў жыцьця“ Ф. Аляхновіча ў гэтай газэце ужо скончыўся, а „Кароткага зарысу Гісторыі Беларускае Літэратуры“ М. Гарэцкага, - яшчэ не.

У сераду 12 кастрычніка г. г. вышаў у Вільні першы нумар газэты на расейскай мове «Виленское Утро».

Вышаў № 3 „Литовскихъ Епархіальныхъ Вѣдомостей“.

У новы склад Літоўскай Епархіяльнай Рады, ужо зацьверджаны Патрыярхам, уваходзяць: ад духавенства пратаярэй А. Сасноўскі (беларус) і сьвяшчэньнік М. Кушнеў (беларус, прадстаўнік праваслаўнага духавенства ў Віленскім Белар. Нацыян. Камітэце); ад міран В. Нядзельскі (беларус) і В. Прадцечаўскі (масковец).

Заняткі ў Літоўскай Духоўнай Сэмінарыі пачаліся 28 (15) верасня ўва ўсіх клясах, апрача сёмай, у якую ня было пададзена належнага ліку просьбаў. У праграму Сэмінарыі ўведзена беларуская мова, гісторыя Беларусі і гісторыя беларускае літэратуры, а таксама польская мова і літэратура. (Літ. Еп. Вѣд.“).

Ксёндз-беларус М. Пятроўскі, пробашч Барунскай парахфіі, які спачатку сядзеў у Лукішскім вастрозе, цяпер, ужо каторы месяц, знаходзіцца пад хатнім арыштам у Вільні Шмат дэлегацый ад беларускіх парахвіян-беларусаў перабывала ў Вільні з просьбай вярнуць ім укаханага пробашча, але скутку покуль што няма.

Мы ўжо пісалі што „Jednaści“, праз яе-ж неасцярожнасьць, прыходзіцца выявіць свой твар ў адносінах да беларускай школы. І вось у пятніцу 14 кастрычніка вышаў яшчэ адзін яе нумар, у якім аб беларускіх школах... ні славечка. Мабыць, гэтае пытаньне за праўды для яе „страшнае“ (гл. № 5 „Бел. Вед.“), але страшнае... з другога боку. Большага ўпадку моральнасьці сярод падобных беларусаў дагэтуль яшчэ ня было. Цяпер мы з віленскім польскім грамадзянствам таварышы па няшчасьцю: там „Жэчпосполіта“, у нас „Jednaść“.

Быўшы Старшыня Управы Віленскага Саюзу кааператываў і адначасна Інспэктар Апразізацыі Віленскага вокругу за час Цывільнага Ураду зямель Усходніх п. Калантай, цяпер працуе ў Глыбокім у акцыянэрнай спулцы пад назвай „Гуртоўня Крэсавая“.

Віленскі Саюз Кааператываў павялічвае лік інструктароў кааперацыі. Патрэбны чатыры новых інструктары, якія будуць узяты з сярод працаўнікоў Саюзу на вывучку і посьле пасланы ў ў павет.

Віленскі Саюз Кааператываў павялічыў пэнсію працаўнікам на 40 проц., пачынаючы ад 15 жніўня, апроч таго дае на кожнага чалавека сям'і 3.000.

Віленскі Саюз Кааператываў у гэтым годзе выпускае кааператыўныя календары паасобку на трох мясцовых мовах: беларускай, літоўскай, і жыдоўскай. Што тычыцца календара ў польскай мове, дык вырашана выдаць такі календар супольна з Польскім Саюзам Спажывецкіх Таварыстваў (Сполэм), у якім будзе беларускі аддзел. Інструктар Віленскага Саюзу Кааператываў п. Вольскі быў дэлегаваны у Варшаву і ад „Сполэма“ атрымаў згоду.

УСЯЧЫНА.

Лічбы сусьветнай вайны.

СТРАТЫ У ЛЮДЗЯХ:

Забіта (ва усіх краёх)	9.500,000
Абязьвечана	10.000 000
Ранных	16.000.000
Усяго	35.500.000

Што гэта знача 9.500.000 забітых? Калі вылажыць гэтых нябожчыкаў плячо к плячу ад Парыжа да Уладзівастока, гэта знача праз ўсю Эўропу і Азію, дык патрэбна толькі 7.000.000 нябожчыкаў. Дзеля перавозкі іх, як гарматняга мяса, патрабуецца 1200 маршрутных цягнікоў.

ВЫДАТКІ НА ВАЙНУ:

З 1 жніўня 1914 г. па 1 жоіўня 1918 г. выдана ў нямецкіх марках па курсу даваеннага часу:

Маскоўшчына	172.368.809.000 мрк.
Англія	153.404.000.000
Нямеччына	115.211.000.000
Францiя	84.759.000.000
Амерыка	64,360,000.000
Аўстра-Венгрыя	79.424.000.000
Італія	35.800.000.000
Іншыя гаспадарствы	3.353.000.000
Разам ўсе	683,679.000.000 мрк.

Пры гэтым выдавалася:

у дзень	968.204.759 мрк.
у гадзіну	19.508.533
у мінуту	325.159
у секунду	5.420

А. С.

Курс на грошы ў Вільні.

15 кастрычніка 1921 г.	мар.
Царскія 500 р. сэрыя	975
Нямецкія маркі (1000)	48
Ост маркі (1000)	45
Даляры	5800
Золата рублі (100)	235.000

Рэдактар-выдавец М. Гарэцкі.

Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.